УСТАНОВА "БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА"

# САЛАВЕЙ АЛЕСЬ (РАДЗЮК АЛЬФРЭД, КАДНЯК АЛЬБЕРТ)

## ПАЭТ

## 1 МАЯ 1922 Г. – 22 СТУДЗЕНЯ 1978 Г.

**ФОНД № 503**

**ВОПІС № 1**

**1923 г. – 1983 г.**

**МІНСК 2019**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 503**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ А. САЛАЎЯ | 1-17 | 1-3 |
| 1.1. | ЗБОРНІКІ ВЕРШАЎ, ВЕРШЫ | 1-10 | 1-2 |
| 1.2. | ПЕСНЯ, СЦЭНКІ, АПАВЯДАННІ, УСПАМІНЫ | 11-15 | 2 |
| 1.3. | ПЕРАКЛАДЫ | 16-17 | 2-3 |
| 2. | ПЕРАПІСКА | 18-28 | 3-4 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ А. САЛАЎЯ | 18-25 | 3 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ ДА А. САЛАЎЯ АД ЗНАЁМЫХ І ЎСТАНОЎ | 26-28 | 3-4 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА А. САЛАЎЯ, ПРЫСВЯЧЭННІ | 29-33 | 4 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ А. САЛАЎЁМ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ | 34-35 | 4-5 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ ДА ВЫДАННЯ ПАСМЯРОТНАГА ЗБОРНІКА ТВОРАЎ А. САЛАЎЯ "НЯТУСКНАЯ КРАСА" | 36-52 | 5-7 |
| 6. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 53-58 | 7 |

## Прадмова

**Салавей Алесь (сапр. Радзюк Альфрэд, у эміграцыі Альберт Кадняк)** нарадзіўся 1 мая 1922 г. у вёсцы Крысава Койданаўскага пав. (сёння Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Сям'я часта пераязджала з месца на месца: мястэчка Койданава (цяпер Дзяржынск) (1923 г.), Чэрвеньскі павет Мінскай губерніі (цяпер Мінская вобласць) (1928 г.), саўгас Вялікія Навасёлкі Койданаўскага павета (студзень 1933 г.). З 1929 г. да 1933 г. вучыўся ў пачатковай школе ў вёсцы Вялікія Навасёлкі, з 1933 г. да 1937 г. – у Койданаўскай школе. З 1938 г. да 5 лютага 1940 г. вучыўся ў педагагічным вучылішчы г. Мінска, якое не скончыў. Працаваў на пасадзе намесніка адказнага рэдактара ў Лагойскай раённай газеце "Чырвоная Лагойшчына" (з 5 лютага 1940 г. да 22 чэрвеня 1941 г.), вярстальшчыкам у рэдакцыі "Беларускай газэты" (з 19 кастрычніка 1941 г. да 10 лютага 1942 г.), кароткі час – пісарам ва ўправе г.п. Ілля Вілейскага раёна. У 1942 г. пераехаў жыць у Рыгу, дзе працаваў сакратаром, а потым – намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Новы шлях" (з 9 кастрычніка 1942 г. да жніўня 1944 г.). Потым жыў у Эстоніі, Латвіі, Беластоку (1944 г.), Берліне. У Берліне кароткі час працаваў бібліятэкарам пры Беларускай Цэнтральнай Радзе. Потым выехаў у Прагу, адтуль – у Вену. У Вене прабыў зусім мала. Пасля Другой сусветнай вайны апынуўся ў Зальцбургу (Аўстрыя), дзе ўдзельнічаў у выданні газеты "Зь беларускага жыцьця" і часопіса "Пагоня". З 1945 г. да 1949 г. знаходзіўся ў Аўстрыі ў "лагеры для перамешчаных асоб" – у амерыканскай зоне. У 1949 г. разам з сям'ёй выехаў у Адэлаіду (Заходняя Аўстралія). У 1963 г. перабраўся ў Мельбурн.

Сябра Згуртавання беларусаў Аўстраліі ў штаце Вікторыя, пазней культурны рэферэнт Беларускага цэнтральнага камітэта ў штаце Вікторыя. Сябра беларускай секцыі радыё 3ZZ у Мельбурне (1976-1977).

Упершыню выступіў у друку ў чэрвені 1937 г. з вершам "На сенажацці" ў газеце "Ударнік Дзяржыншчыны". У 1944 г. у Рызе выйшаў яго першы зборнік "Мае песні". Друкаваўся ў "Беларускай газэце", "Голасе вёскі", "Піянер Беларусі", "Сакавіку", раённай газеце "Ударнік Дзяржыншчыны", "Шыпшыне". Пісаў пад псеўданімамі: А. Вясёлка, Алесь Вясновы, Антон Дабрыдзень, Максім Блакітны, Тамара Залеская, Тодар Быльнюк, Банадысь Свой, Рыгор Тойсамы. Аўтар: зборнікаў вершаў - "Сіла гневу" (1948), "Нятускная краса (1977, надрукаваны пасмяротна, 1982), "Несмяротнасьць" (не друк., 1952); аўтабіяграфічнай паэмы "На хуткіх крыльлях вольнага Пэгаса" (1943); вершаў – "Кінь сваволіць пад вокнамі, вецер.." (1942), "Клён шапацеў на сьцямнелым двары…" (1943), "Дабрыдзень, мая зарніца.." (1945), "Белы сьнег" (1950), "Маме" (1967) і інш.; апавяданняў – "Шчасьлівае маленства" (1942), "Чужы" (1946). Перакладаў творы украінскіх паэтаў І. Качуроўскага і Б. Аляксандрава, аўстралійскіх паэтаў на беларускую мову. Творы

А. Салаўя перакладзены на англійскую, польскую, украінскую мовы. Верш “Вецер, буй-вецер…” (1938) пакладзены на музыку А. Клумавым.

Памёр А. Салавей 22 студзеня 1978 г. Пахаваны на беларускіх могілках Фоўкнер (Fawkner Memorial Park) у Мельбурне.

Дакументы А. Салаўя паступілі ў БДАМЛМ у некалькі этапаў: у верасні 1999 г. ад Вітаўта Кіпеля, у красавіку 2014 г. – асобныя аўтографы і здымкі са збораў Беларускага інстытута навукі і мастацтва (БІНіМа) былі прывезены гісторыкам Н.С. Гардзіенкай, у 2017-2018 гг. – архівістам Лявонам Юрэвічам (Нью-Ёрк). Пераважна матэрыялы былі сабраны ў часе падрыхтоўкі да выдання ў БІНіМе збору твораў паэта “Нятускная краса” (Нью-Ёрк, Мельбурн, 1982). У выніку навуковага апісання быў створаны вопіс № 1, сфарміравана 58 спраў (401 дак.) за 1923 – 1983 гг.

Вопіс складаецца з 6 раздзелаў, 5 падраздзелаў:

Раздзел 1. “Рукапісы А. Салаўя” складаецца з 3-х падраздзелаў, справы ў якіх сістэматызаваны па жанрах, унутры – па храналогіі. У раздзел увайшлі дакументы, якія ахопліваюць творчую дзейнасць А. Салаўя за 1937-1977 гг. Гэта зборнікі вершаў - “Сіла гневу”, “Несьмяротнасьць”, “Нятускная краса”, вершы, сцэнкі “Дух праўды, духу зла непадуладны”, “Зазьзяе прабуджальная дзяньніца”; апавяданні “Шчасьлівае маленства”, “Чужы”; успаміны пра сваё жыццё; за падраздзелам змешчаны пераклады А. Салаўя вершаў М. Дунна, А. Міцкевіча, Л. Палтавы з англійскай, польскай, украінскай моў і пераклады яго твораў Б. Аляксандравым, А. Галанам, І. Качуроўскім за 1946-1955, 1975, 1980 гг.

Раздзел 2. “Перапіска” складаецца з 2-х падраздзелаў: “Пісьмы А. Салаўя” і “Пісьмы да А. Салаўя ад знаёмых і ўстаноў”, справы ў якіх сістэматызаваны па алфавіце прозвішчаў адрасатаў і карэспандэнтаў за 1946-1977 гг.

У раздзеле 3. ”Дакументы пра А. Салаўя, прысвячэнні” справы сістэматызаваны па храналогіі. У ім змешчаны: анкета-заява сябра БІНіМа; артыкулы; вершы А. Змагара, І. Качуроўскага, Б. Аляксандрава, прысвечаныя А. Салаўю; артыкулы пра выступленні А. Салаўя на творчых вечарах; артыкулы, прысвечаныя яго памяці і інш. за 1948-1980 гг.

У невялікі раздзел 4. “Дакументы, сабраныя А. Салаўём па цікавых для яго тэмах” увайшлі вершы Н. Арсенневай, В. Ластоўскага, К. Данелайціса; юбілейны зборнік “25-лецьце Беларускае Гімназіі ў Вільні. 1919-1944”.

У раздзеле 5. “Дакументы, сабраныя да выдання пасмяротнага зборніка твораў А. Салаўя “Нятускная краса” справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе за 1979-1983 гг.

У раздзеле 6. “Выяўленчыя дакументы” справы сістэматызаваны па храналагічна-намінальным прынцыпе за 1949-1980 гг.

Прадмову склала
вяд. архівіст Н.П. Прынько
2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ А. САЛАЎЯ** | | | | |
| | **1.1. ЗБОРНІКІ ВЕРШАЎ, ВЕРШЫ** | | | | |
| 1 | "Сіла гневу". Зборнік вершаў.<br>Аўтограф | 1937-1948 | 48 | 1 | |
| 2 | "Несьмяротнасьць". Зборнік вершаў. Няпоўны тэкст. Варыянты.<br>Аўтограф | 1947-1952 | 46 | 1 | |
| 3 | "Нятускная краса". Зборнік лірыкі.<br>Ксеракопія аўтографа | 1977 | 170 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Нятускная краса". Збор твораў, падрыхтаваны да выдання БІНІМ. Нью-Ёрк - Мельбурн. Няпоўны тэкст.<br>Ксеракопіі машынапісу, часопісаў і газет з нязначнымі праўкамі | 1981 | 57 | 1 | |
| 5 | "Букет", "Вільня", "Героям Бацькаўшчыны" і інш. Падборка вершаў да зборніка "Сіла гневу".<br>Аўтограф, ксеракопія аўтографа | 1937-1947 | 14 | 1/13 | |
| 6 | "Клён шапацеў на сьцямнелым двары...", "Маладосьць", "Ой-жа хітруньніца якая..." і інш. Падборка вершаў да зборніка "Вянкі".<br>Аўтограф, ксеракопія аўтографа | 1941-1957 | 7 | 1/7 | |
| 7 | "Бывайце", "З Новым годам!", "Кінь сваволіць пад вокнамі, вецер...", "Маме". Вершы (некаторыя - пад псеўданімамі А. Вясёлка, Максім Блакітны). Варыянты.<br>Аўтограф, ксеракопія аўтографа, машынапіс, ксеракопія выразкі з газеты | 1942-1961 | 18 | 17 | |
| 8 | "Ахвяраў прагне сьмерць...", "Белы сьнег", "Вітаньне Случчыне" і інш. Вершы.<br>Ксеракопіі і выразкі з часопіса і газет, часопіс "Новы шлях" № 4 за люты 1944 г. | 1942-1952, 1970 | 18 | 15 | |
| 9 | "Аб табе успамін - найвышэйшая ўцеха...", "Дабрыдзень, мая зарніца...", "Маладосьць" і інш. | 1944-1947 | 11 | 8 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Вершы, дасланыя А. Салаўём для публікацыі ў часопісе "Наперад".<br>Аўтограф | | | | |
| | * * * | | | | |
| 10 | "Дзед Мароз", "Зайчык", "Нішто" і інш. Вершы. Рукапіс А.Я. Адамовіча, М. Панькова, [З. Кіпель]. 1979-1981.<br>На л.2 змешчана запіска М. Панькова да З. Кіпель па пытанні выдання пісем А. Салаўя | [пасля 1959 г.] | 4 | 3 | |
| | **1.2. ПЕСНЯ, СЦЭНКІ, АПАВЯДАННІ, УСПАМІНЫ** | | | | |
| 11 | І. Паўлаў. "Малітва". Песня для голасу з фартэпіяна. Словы А. Салаўя.<br>Ксеракопія выразкі з газеты | 1946 | 3 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | "Дух праўды, духу зла непадуладны", "Зазьзяе прабуджальная дзяньніца". Сцэнкі.<br>Ксеракопіі аўтографа і машынапісу | 1946 - [1960-я гг.] | 10 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | Т. Быльнюк."Шчасьлівае маленства", Т. Залеская "Чужы". Апавяданні.<br>Ксеракопіі газет | 1942, 1946 | 5 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | "Karotki zycciapis". Успаміны пра сябе.<br>Часопіс "Belaruski Holas" № 13 за 31.03.1944 г. Вільня.<br>На беларускай мове лацінкай | | 3 | 1 | |
| 15 | "Сорак дзён (Успаміны над сьвежай магілай)". Успаміны пра Л. Нікан (жонку М.А. Нікана).<br>Ксеракопія выразкі з газеты | 1973 | 1 | 1 | |
| | **1.3. ПЕРАКЛАДЫ** | | | | |
| 16 | А. Міцкевіч. "Да Нёману", Л. Палтава. "У бальніцы", М. Дунн. "Скакаў я, пакуль дзьвюх ступняў ня меў". Вершы. Пераклады А. Салаўя з англійскай, польскай, украінскай моў. Варыянты.<br>Аўтограф, ксеракопія часопіса "Беларуская моладзь" (Нью-Ёрк) | 1948-1955, 1975 | 6 | 4 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 17 | А. Салавей. "Гудуть, дзвенять, Софіі дзвони", "Дзвін", "Зажурена мати" і інш. Вершы. Пераклады А. Галана, І. Качуроўскага, Б. Аляксандрава на ўкраінскую мову.<br>Машынапіс, ксеракопіі друкаваных выданняў, выразкі з газет.<br>Прыкладзена пісьмо неўстаноўленай асобы аб перасылцы перакладаў вершаў А. Салаўя | 1946-1980 | 19 | 12 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА** | | | | |
| | **2.1. ПІСЬМЫ А. САЛАЎЯ** | | | | |
| 18 | Пісьмы і віншавальная паштоўка А. Салаўя да А. Адамовіча аб выданні вершаў у газеце "Бацькаўшчына" і па інш. пытаннях | 1955-1977 | 14 | 9 | |
| 19 | Пісьмы Ю. Віцьбічу.<br>Арыгінал і электронная копія | 1946-1952 | 41 | 30 | |
| 20 | Пісьмы М. Ганько (5), У. Глыбіннаму, А. Грыцуку (6) і інш.<br>Арыгінал, ксеракопіі | 1948-1950, 1965, 1977 | 22 | 14 | |
| 21 | Пісьмы А. Лашуку.<br>Ксеракопіі | 1947-1948 | 10 | 6 | |
| 22 | Пісьмы А. Міцкевічу.<br>Ксеракопіі | 1946-1949 | 7 | 7 | |
| 23 | Пісьмы М. Скабею.<br>Машынапісныя копіі | 1949-1950 | 27 | 20 | |
| 24 | Пісьмы В. Тумашу | 1946-1948 | 29 | 13 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Пісьмы А. Салаўя ў рэдакцыі газет і часопіса: "Бацькаўшчына", "Беларускія Навіны", БІНІМ (Нью-Ёрк) па пытаннях пералічэння грашовых сродкаў за газету, выдання вершаў і інш.<br>Прыкладзены верш А. Салаўя "Усьцяж". 1966. Л. 17 | 1947, 1955-1968 | 18 | 16 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ ДА А. САЛАЎЯ АД ЗНАЁМЫХ І ЎСТАНОЎ** | | | | |
| 26 | Пісьмо А. Кавалеўскага. Без канца.<br>Ксеракопія аўтографа | 1947 | 3 | 1 | |
| 27 | Пісьмы Ю. Віцьбіча | 1951-1952 | 4 | 3 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 28 | Пісьмы Украінскай студэнцкай грамады ў Зальцбургу, Згуртавання беларуска-амерыканскай моладзі да А. Салаўя з падзякамі.<br>Ксеракопіі | 1947, 1953 | 2 | 2 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ПРА А. САЛАЎЯ, ПРЫСВЯЧЭННІ** | | | | |
| 29 | Анкета-заява аб залічэнні ў лік сяброў БІНІМа А. Салаўя. Нью-Ёрк.<br>Ксеракопія аўтографа | 1955 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 30 | Вершы А. Змагара, І. Качуроўскага, Б. Аляксандрава, прысвечаныя А. Салаўю.<br>Рукапіс А. Салаўя, аўтограф І. Качуроўскага, выразка з друкаванага выдання, машынапіс | 1945-1948 | 4 | 4 | |
| 31 | Артыкулы пра выступленні А. Салаўя на творчых вечарах ва ўкраінскім тэатры і тэатральнай залі 1-га лагера ў Зальцбургу, лагера ДП у ангельскай зоне Аўстрыі.<br>Выразка з газеты, ксеракопіі газет | 1945-1946 | 3 | 3 | |
| 32 | В. Шэлест. "Борис Олександрів - поет і гуморист". Артыкул да 50-годдзя з дня нараджэння Б. Аляксандрава з упамінаннем А. Салаўя.<br>Выразка з часопіса "Молода Україна" (Торонто) | 1971 | 2 | 1 | |
| 33 | Артыкулы А. Калодкі, Д. Чуба і інш., прысвечаныя памяці А. Салаўя.<br>Выразкі з газеты, часопісаў | 1978-1980 | 7 | 4 | |
| | **4. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ А. САЛАЎЁМ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ** | | | | |
| 34 | Н. Арсеннева. "Варта жыць", В. Ластоўскі. "Крыжовы паход дзяцей", "Пішы" і інш. Вершы. К. Данелайціс. "Зноў узьнімаецца сонца вышэй і зямлю абуджае...". Верш. Пераклад А. Зарыцкага з літоўскай мовы.<br>Рукапіс А. Салаўя | 1923-1925, 1943, 1961 | 14 | 3 | |
| 35 | "25-лецьце Беларускае Гімназіі ў Вільні. 1919-1944". Юбілейны зборнік. Вільня (змешчаны верш А. Салаўя "Сад").<br>Ксеракопія друкаванага выдання | 1944 | 25 | 1 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ ДА ВЫДАННЯ ПАСМЯРОТНАГА ЗБОРНІКА ТВОРАЎ А. САЛАЎЯ "НЯТУСКНАЯ КРАСА"** | | | | |
| 36 | Дакументы, сабраныя да выдання збору твораў А. | 1979-1982 | 32 | 31 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Салаўя "Нятускная краса" (бібліяграфія твораў за 1938-1979 гг., змест, дамова М. Прускага з БІНІМ і інш.).<br>Машынапіс, ксеракопія машынапісу, рукапіс З. Кіпель | | | | |
| 37 | Дакументы па збору сродкаў на выданне збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" (спіс ахвярадаўцаў, старонкі і ксеракопіі банкаўскіх чэкавых кніжак, паштовыя пераводы, падпісныя лісты і інш.) | 1979-1980 | 60 | 33 | |
| | * * * | | | | |
| 38 | А. Адамовіч. "Ales Salaviej". Прадмова да збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса". Варыянты. На англійскай мове.<br>Машынапіс з праўкамі | [1979-1981] | 8 | 2 | |
| 39 | А. Адамовіч. "Мастак нятускнае красы: Алесь Салавей - біяграфічна-крытычны нарыс". Артыкул да зборніка твораў А. Салаўя "Нятускная краса". Варыянты.<br>Ксеракопія аўтографа, машынапіс з нязначнымі аўтарскімі праўкамі | [1979-1981] | 56 | 2 | |
| 40 | М. Ганько. "Я памятую...", неўстаноўлены аўтар "Алесь Салавей". Артыкулы пра А. Салаўя да зборніка твораў "Нятускная краса".<br>Машынапіс, машынапіс з нязначнай праўкай [А. Адамовіча], машынапіс з рэдактарскімі праўкамі В. і З. Кіпеляў.<br>Прыкладзена пісьмо М. Ганько аб прадстаўленні матэрыялаў да зборніка твораў ад 24.03.1980 г. Л.6 | [1979-1980] | 14 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 41 | Ілюстрацыі Р. Ляўчука да зборніка твораў "Нятускная краса".<br>Ксеракопіі | 1981 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 42 | Пісьмы К. Барысаўца, Ч. Будзькі (3), У. Глыбіннага, В. Жук-Грышкевіча, А. Карповіча, А. Надсана (2), М. Панькова, В. Рамука, А. Яцэвіча і інш. да А. Адамовіча, В. і З. Кіпеляў па пытанні падрыхтоўкі і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1979-1980 | 24 | 13 | |
| 43 | Пісьмы У. Брылеўскага да З. Кіпель (2), В. Тумаша. Прыкладзена пісьмо З. Кадняк (жонкі А. Салаўя) з | 1979-1980 | 17 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | успамінамі пра А. Салаўя | | | | |
| 44 | Пісьмы З. Кадняк (жонкі А. Салаўя) да А. Адамовіча (4), З. Кіпель з успамінамі пра А. Салаўя і па пытанні выдання збору твораў "Нятускная краса". Арыгіналы, ксеракопіі. На адвароце л.1 - верш А. Салаўя "Вам хочацца". 1952 г. | 1979-1983 | 29 | 7 | |
| 45 | Пісьмы А. Калодкі (2), А. Каранеўскай, М. Лужынскага да В. Тумаша; А. Калодкі да З. Кіпель па пытанні збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1979-1980 | 13 | 4 | |
| 46 | Пісьмы В. і З. Кіпеляў да Ч. Будзькі, М. Лужынскага і інш. па пытанні падрыхтоўкі і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1979-1982 | 4 | 4 | |
| 47 | Пісьмы М. Прускага да В. Тумаша па пытанні падрыхтоўкі, набору і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1979-1980 | 11 | 11 | |
| 48 | Пісьмы М. Скабея да В. Тумаша (14), З. Кіпель (2) па пытанні набору і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1979-1981 | 20 | 15 | |
| 49 | Пісьмы В. Тумаша да А. Калодкі, М. Прускага (13), М. Скабея (9) і інш. па пытанні падрыхтоўкі, набору і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1979-1981 | 27 | 26 | |
| 50 | Пісьмы А. Лашука да В. і З. Кіпеляў па пытанні падрыхтоўкі і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1980 | 4 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 51 | Пісьмы А. Лашука (3), К. Станкевіча, Х. Шыбута ў БІНІМ па пытанні падрыхтоўкі і выдання збору твораў А. Салаўя "Нятускная краса" | 1980-1982 | 12 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 52 | Запіска А. Калодкі да неўстаноўленай асобы пра А. Салаўя. Да запіскі прыкладзены творы А. Салаўя: вершы, нататка, пераклад верша М. Дунна, запіска А. Салаўя да А. Калодкі ад 15.05.1977 г. Ксеракопіі | 1978 | 9 | 9 | |

## 6. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 53 | Фатаграфіі А. Салаўя, індывідуальныя | 1951, 1954 | 2 | 2 | |
| 54 | Фатаграфіі А. Салаўя з З. Кадняк (жонкай) і дзецьмі | 1949-1955 | 6 | 6 | |
| 55 | Фатаграфія А. Салаўя ў групе з Х. Ілляшэвічам, Т. Лебядой, М. Сяднёвым, У. Сядурам, В. Сіратой, С. Хмарам на ІІ Усебеларускім Кангрэсе ў Мінску | 27 чэрвеня 1944 г. | 1 | 1 | |
| 56 | Фатаграфіі пахавання А. Салаўя і надмагільнага помніка ў Мельбурне на беларускіх могілках Фоўкнер (Fawkner Memorial Park) | 1978 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 57 | Вокладка кнігі А. Салаўя "Зьвіняць званы Сьвятой Сафіі" (Зальцбург). 1944 г.<br>Ксеракопія.<br>Неўстаноўлены мастак. Ілюстрацыі да кнігі А. Салаўя.<br>Папера, аловак, фотакопія | | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 58 | Віншавальная паштоўка з вершам А. Салаўя "На беспрасьветным нашым бездарожжы".<br>На адвароце - віншаванне Ч. Будзькі неўстаноўленай асобе | 1979-1980 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 58 (пяцьдзесят восем)

спраў з № 1 па № 58 , 401 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.